Сяргей Чыгрын




# Слонімшчына
## ў люстэрку фалерыстыкі






















**Сяргей Чыгрын**

# Слонімшчына
# ў люстэрку фалерыстыкі








**Ліда**
**“Пружмень”**
**2024**

pawet.net

Культурна-краязнаўчае выданне

Сяргей Мікалаевіч Чыгрын. Слонімшчына ў люстэрку фалерыстыкі. На беларускай мове. Ліда. 2024, 40 с.

Рэдактар - Алесь Сярожкін.
Тэхнічны рэдактар - Станіслаў Суднік.
Набор - Сяргей Чыгрын.

Мэта выдання - падсумаваць усё тое, што ёсць на сённяшні дзень пра Слонімшчыну ў беларускай фалерыстыцы.

# Фалерыстыка

Тэрмін "фалерыстыка" ўпершыню стаў ужывацца ў 1937 годзе чэхаславацкім калекцыянерам узнагарод Олдржыхам Пільцам. А ў былым Савецкім Саюзе пра фалерыстыку ўпершыню напісаў Раман Шэйн з Баку ў артыкуле "Фалерыстыка - сястра нумізматыкі", які быў апублікаваны ў часопісе "Дэкаратыўнае мастацтва СССР" у 1965 годзе.

Да першай групы фалерыстыкі адносяцца ордэны, медалі, значкі, жэтоны і форменная фурнітура (какарды), выраблены высокай якасці, якія маюць спецыяльныя ўпакоўкі, збераджэнне і сур'ёзную якасць тэхналагічнага сартавання.

Да другой групы фалерыстыкі адносяцца службовыя знакі, сувенірныя значкі, памятныя і сувенірныя жэтоны, форменная фурнітура (асноўная частка прадметаў) высокай і сярэдняй якасці выпуску.

На вялікі жаль, у Беларусі няма спецыяльнага выдання для фалерыстаў і, наогул, для калекцыянераў. Напачатку 1990-х гадоў калекцыянеры Алесь Сярожкін і Уладзімір Цярохін выдавалі ў Оршы газету "Беларускі калекцыянер". Выйшлі з друку 24 нумары, а потым выданне, з-за недахопу фінансаў, спыніла сваё існаванне.

# З гісторыі Слоніма

Слонім заснаваны ў першай палове XI стагоддзя. У 1040 годзе адбыўся паход кіеўскага палка князя Яраслава Мудрага на паселішчы панёманскай Літвы (Гарадзеншчыны). Як пішуць даследчыкі, спасылаючыся на вядомага польскага гісторыка XV стагоддзя Яна Длугаша, Яраслаў Мудры, "спаткаўшыся на палях сломінскіх (слонімскіх) з літвінамі, перамог іх так, што затым, праехаўшы ўласна Літву да самага Нёмана, прымусіў яе на нейкі час падпарадкавацца".

На думку гісторыкаў, калі існавалі "палі слонімскія", то, лагічна, мусіў існаваць і сам Слонім. Такім чынам, са спасылкай на слыннага гісторыка Длугаша ў гістарычных даведках пра Слонім з'явілася дата - 1040 год. Некаторыя даследчыкі пішуць 1036 год, але ў гістарычнай перспектыве 3-5 гадоў асаблівага значэння не маюць. Згадваецца горад пад 1040 годам і ў летапісе "Аповесць мінулых гадоў". З 1040 да 1252 года ён пабачыў і перажыў шмат бітваў, захопаў і адбудоў. Так, у 1103 годзе каля Слоніма адбылася бітва паўднёварускіх дружын з мясцовымі абаронцамі, але горад атрымалася ўратаваць. У 1241 годзе на Слонім напалі войскі татарскага хана Койдана і амаль цалкам знішчылі гарадскі драўляны замак. На дапамогу прыйшлі дружыны вялікага князя ВКЛ Міндоўга. Усе разам вызвалілі горад ад захопнікаў і адбудавалі замак. З 1245 года Слонім ахоўваўся дружынамі гэтага князя, а з 1248 года тут кіраваў сын Міндоўга Войшалк.

Да XIV стагоддзя назва горада ў пісьмовых крыніцах згадвалася як Услонім, Вслонім, Васлонім. Пытанне паходжання назвы і сёння цікавіць даследчыкаў. Адны з іх падтрымліваюць версію, што горад названы так, бо тут знаходзілі шмат слановых і мамантавых касцей. Іншыя кажуць, што назва паходзіць ад польскіх слоў "слома" (салома) ці "слоніна" (сала), спасылаючыся на саламяныя стрэхі старых будынкаў горада і шырокі гандаль салам. А гісторык Васіль Мялешка некалі пісаў, што назва Слонім паходзіць ад слоў "сленіс", "сленумас", што азначае "нізіна", "нізінны". Мясцовы ж краязнавец Васіль Супрун сцвярджаў, што назва "Услонім" паходзіць ад слова "ўслон", "услона" - заслон, пэўнае

збудаванне, што засланяе. Бо, як вядома, рака Шчара, што працякае праз горад, яшчэ ў старажытныя часы была важнай магістраллю, якая злучала Палессе з Панямоннем і Прыбалтыкай.

З канца XIII стагоддзя Слонім уваходзіў у Вялікае Княства Літоўскае. Пры князю Альгерду горад ахоўваўся яго братам Кейстутам, які валодаў і Трокамі. Князь з сынам Вітаўтам часта бывалі ў слонімскім замку і добра ведалі гэты край. Пасля смерці Кейстута горад перайшоў пад кіраўніцтва Вітаўта. Князь любіў Слонім, ён часта тут бываў, а ў 1409 годзе завітаў сюды з жонкай Ганнай.

Дарэчы, у 1410 годзе ў Грунвальдскай бітве пад камандаваннем вялікага князя Вітаўта змагаліся і слонімскія харугвы. А пасля перамогі Слонімскае княства было ператворана ў Слонімскі павет. Каля 1490 года вялікі князь літоўскі і кароль польскі Казімір Ягелончык побач з Замкавай плошчай пабудаваў першы ў горадзе касцёл. Цяпер на гэтым месцы ўзвышаецца касцёл Святога Андрэя. Вялікі князь Вялікага Княства Літоўскага і кароль польскі Жыгімонт I Стары ў 1532 годзе даў гораду Магдэбургскае права.

Інтэнсіўнае развіццё прыпадае на той час, калі старастам стаў вялікі літоўскі канцлер Леў Сапега. Ён спрыяў развіццю культуры і прамысловасці горада, узвышэнню яго палітычнай значнасці, заснаваў у горадзе над Шчарай першы ткацкі цэх. Калі вы ўпершыню завіталі ў Слонім, лепш за ўсё пачаць знаёмства з горадам менавіта з плошчы Льва Сапегі. Тут узвышаецца касцёл Святога Андрэя, пабудаваны ў 1775 годзе. Святары распавядуць гісторыю пра тое, як у слонімскім касцёле ў адмысловым куфэрку захоўвалася сэрца Міхала Казіміра Агінскага.

З плошчы Льва Сапегі вы можаце перайсці праз некалькі мастоў і трапіць у гарадскі парк, праз які працякае вядомы канал Агінскага. (Так-так, я не памыліўся, менавіта канал Агінскага.) Справа ў тым, што росквіт Слоніма ў другой палове XVIII стагоддзя звязаны з дзейнасцю вялікага гетмана літоўскага Міхала Казіміра Агінскага. У 1771 годзе Агінскі перайшоў на бок Барскай канфедэрацыі, але не змог са сваім войскам захапіць Нясвіж і Слуцк. У ноч на 23 верасня 1771 года яго трохтысячнае войска было разбіта рускімі войскамі Суворава. Пасля паразы Міхал Казімір Агінскі

эмігрыраваў. Але праз чатыры гады вярнуўся ў Слонім, дзе пабудаваў некалькі прадпрыемстваў, друкарню, заснаваў тэатр і капэлу. Па яго ініцыятыве і на яго сродкі быў пабудаваны ў Слоніме і канал.

У тэатры Агінскага працавалі прафесійныя беларускія, польскія, нямецкія, італьянскія оперныя і драматычныя акцёры, мастакі, прыгонны хор і балет. Тэатр меў філіялы. Рэпертуар, які ставіўся на сцэне тэатра, уключаў 60 опер, 18 балетаў, 3 музычныя камедыі, 253 сімфоніі і больш як 460 іншых музычных твораў. У 1781 годзе функцыянаваў "плывучы тэатр" на баржах на Агінскім канале. А "дом оперы" меў вялікую сцэну, прыстасаваную для паказу любых барочных спектакляў, оперных і балетных, для выхаду вялікай колькасці спевакоў і артыстаў, для баталій коннікаў і водных феерый (частка сцэны затаплялася вадой з канала, і па ёй плавалі лодкі), для складаных дэкарацый, розных сцэнічных эфектаў. Побач з тэатрам у 1765 годзе пачала дзейнічаць першая кавярня ("кафенхаус"). Гэта быў шыкоўны цагляны будынак, аздоблены шаўковымі шпалерамі і гравюрамі на медзі. Посуд тут быў фаянсавы варшаўскай вытворчасці.

Міхал Казімір Агінскі пісаў музыку і літаратурныя творы, некаторыя з іх былі надрукаваны ў слонімскай друкарні. Як згадваецца ў крыніцах, калі памёр Жан Жак Русо, Агінскі выправіўся да караля і сказаў: "Ваша міласць, памёр мой калега!". Кароль палічыў, што гаворка ідзе пра польскага гетмана Сасноўскага. "Не, - запярэчыў Агінскі, - я маю на ўвазе смерць Русо!". Калі ж ён убачыў здзіўленне караля, то патлумачыў: "Бо Русо ж напісаў музыку да оперы Le Devin du Village. Я таксама пісаў лібрэта і музыку да опер, якія былі пастаўлены ў Слоніме. У гэтым сэнсе Русо - мой калега!".

Тэатр Агінскага ў Слоніме знаходзіўся на Опернай вуліцы. На вялікі жаль, будынак тэатра да сённяшніх дзён не захаваўся. Але ёсць у нас Оперная вуліца - назвы такой не мае ні адзін горад у свеце. Захавалася аўстэрыя, пабудаваная з цэглы архітэктарам Я. Боем, які праектаваў пры палацы Агінскага шэраг барочных надворных пабудоў. Палова першага паверха аўстэрыі выкарыстоўвалася як гасцёўня, перакрытая чатырма ветразевымі скляпеннямі з цэнтральнай апорай. Пад гэтай часткаю дома

знаходзяцца шырокія скляпеністыя сутарэнні. Цэнтральная лесвіца вузкага вестыбюля вядзе на другі жылы паверх. Аўстэрыя - адзіная пабудова аднаго з найцікавейшых палацавых ансамбляў Беларусі другой паловы XVIII стагоддзя, што ацалела.

Слонім часоў Агінскага нярэдка называлі палескімі Афінамі. Сюды ў святочныя дні з'язджаліся вяльможы і багатая шляхта з усяго краю і нават з Варшавы. Скверы, сады, аранжарэі і рыбныя ставы стваралі і даглядалі найлепшыя спецыялісты Еўропы. Дарэчы, у Слоніме пры двары Міхала Казіміра Агінскага прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады яго пляменніка Міхала Клеафаса Агінскага, аўтара вядомага ўсім паланэза "Развітанне з Радзімай".

Тэатральны шлях, які пачаў у Слоніме Міхал Казімір Агінскі амаль 300 гадоў назад, доўжыцца і сёння. У горадзе існуе прафесійны дзяржаўны драматычны тэатр, які ставіць спектаклі па п'есах беларускіх, расійскіх, польскіх, французскіх і італьянскіх драматургаў як для дарослых, так і для маленькіх гледачоў. Насупраць тэатра ў Дзень беларускага пісьменства ў 2019 годзе быў адкрыты помнік былому старасту Слоніма Льву Сапегу, а каля канала Агінскага ўстановілі бюст Міхалу Казіміру Агінскаму.

Славіцца Слонім і сваімі архітэктурнымі пабудовамі. У цэнтры Слоніма знаходзіцца кляштар бернардзінак і кляштар бернардзінцаў, Спаса - Праабражэнскі сабор, сінагога. Слонімская сінагога - самы стары архітэктурны помнік у горадзе. Яна пабудавана ў 1642 годзе.

Слонім - горад шматканфесійны. На левым беразе канала Агінскага знаходзіцца мячэць. Можна завітаць і сюды, дзе імам слонімскай мусульманскай абшчыны Сулейман Байрашэўскі раскажа гісторыю мусульман на нашай зямлі, зробіць экскурсію па мячэці. Татары ў Слоніме пасяліліся ў XVI стагоддзі, а ў 1765 годзе тут ужо была мячэць.

Пазнаёміўшыся з усімі канфесіямі і іх храмамі, варта вярнуцца ў цэнтр горада і наведаць краязнаўчы музей імя Язэпа Стаброўскага. Ён быў археолагам, краязнаўцам, гісторыкам, філосафам і на аснове ўласнай калекцыі стварыў у 1929 годзе краязнаўчы музей, на адкрыццё якога прыязджаў нават прэзідэнт Польшчы Ігнацы Масціцкі.

Сапраўдны росквіт музей атрымаў у канцы 1939 года і напачатку 1940-х гадоў. Жыхары горада і раёна ахвотна наведвалі

яго. Дзякуючы нашаму гісторыку і краязнаўцу, ён узбагаціўся - мінералагічнай і палеанталагічнай экспазіцыямі, выстаўкамі па гісторыі і рэлігіі, карцінамі, нумізматыкай, этнаграфічным матэрыялам. Усё складвалася даволі добра, але перашкодзіла вайна. У чэрвені 1941 года гаспадарамі ў Слоніме ўжо былі немцы. І ўсё ж 2 кастрычніка 1942 года на Паркавай вуліцы, 42 у старажытным горадзе над Шчарай музей зноў адчыніў свае дзверы.

Ад краязнаўчага музея вам трэба толькі перайсці вуліцу - і трапіце ў музей кнігі Слонімскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Якуба Коласа. Гэта першы музей кнігі ў Гродзенскай вобласці. Складаецца ён з трох залаў. Адна зала прысвечана класіку Якубу Коласу, другая - распавядае пра літаратурную Слонімшчыну, а трэцяя - гэта музей аднаго са знакамітых слонімцаў - Алега Лойкі, пісьменніка і педагога, доктара філалагічных навук, прафесара, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. А яшчэ вы абавязкова павінны завітаць у Альбярцін - стары мікраараён горада. Раней тут знаходзілася сядзіба маршалка шляхты Слонімскага павета Войцеха Пуслоўскага. Да сённяшніх дзён захаваўся яго палац, дзе некалі была багатая калекцыя твораў мастацтва, захаваліся флігель, стайня і пейзажны парк.

Гісторыя Слоніма і яго ваколіцаў, помнікі, падзеі і людзі, прадпрыемствы і навучальныя ўстановы адлюстраваны ў фалерыстыцы. Гэта першая спроба ажыццявіць каталагізацыю слонімскіх значкоў, медалёў і жэтонаў. Хаця ўсе звесткі пра слонімскую фалерыстыку сабраць у адзін каталог немагчыма. Але на сёння ў гэтым выданні - найбольш поўнае іх адлюстраванне і апісанне. Аўтар шчыра дзякуе ўсім слонімцам, хто дапамагаў у зборы слонімскай фалерыстыкі, а таксама шчыра дзякуе калекцыянерам Алесю Сярожкіну з Оршы і Мікалаю Міронаву з Мінска за дапамогу ў пошуках слонімскай фалерыстыкі.

## Значкі з гербам Слоніма

Выпушчана значкоў з выявамі гербаў Слоніма даволі шмат. Гэтыя гербы выклікаюць у гісторыкаў і калекцыянераў неадназначныя думкі. Напрыклад, быў выпушчаны значок, на якім адлюстраваны герб Слоніма, зацверджаны 6 красавіка 1845 года, у той час, калі горад над Шчарай уваходзіў у склад Расійскай імперыі. Гэты герб уяўляў сабой шчыт, які падзелены на дзве палавіны: у верхняй змешчаны зубр, як эмблема тагачаснай Гродзенскай губерні, а ў ніжняй палавіне на блакітным полі - два скрыжаваныя мячы, паміж якімі стаіць дата - 1275. У гэтым годзе князі галіцка-ўладзімірскія адваявалі Слонім у Літвы.

Вялікую цікавасць у слонімскіх фалерыстаў выклікаюць значкі з гербам Льва Сапегі. Гэты герб па хадайніцтву слонімскага старосты Сапегі быў дадзены каралём Жыгімонтам III 4 студзеня 1591 года. Да сённяшняга дня ён з'яўляецца гербам Слоніма і афіцыйна зацверджаны Слонімскім райвыканкамам. Значкоў з афіцыйным гербам Слоніма выпускаецца ўсё больш і больш. На адных з іх адлюстраваны леў, на другіх - леў і дата - 1252, якія сведчыць аб першым упамінанні горада ў Іпацьеўскім летапісе. Ці проста выпускаюцца значкі з адным гербам Слоніма.








Слоним
755 лет


СЛОНІМ


СЛОНІМ


СЛОНІМ


СЛОНІМ


ГЕРАЛЬДЫКА ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ
СЛОНІМ


СЛОНИМ


СЛОНІМ


СЛОНІМ
52






СЛОНИМ


Слоним

СЛОНИМ
1275г

1275
Слоним

СЛОНИМ
1275

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ГЕРАЛЬДЫКІ
1275
СЛОНІМ

СЛОНИМ

СЛОНИМ

СЛОНІМ
1252
750
2002

СЛОНІМ

СЛОНІМ


Слонім

# Нагрудны знак, пачатак ХХ стагоддзя

Напачатку ХХ стагоддзя члены Слонімскай гарадской управы насілі нагрудныя знакі. У кожнай гарадской управе, відаць, яны былі свае і адрозніваліся ад іншых. Нагрудныя знакі мелі і слонімцы. Адзін са знакаў захоўваецца ў Слонімскім краязнаўчым музеі.



# Слонімскі службовы знак "Сельскі стараста", 1861 год



Пры Расійскай імперыі ў кожным павеце сельскія старасты насілі службовыя знакі. У Слонімскім павеце, напрыклад, у 1861 годзе сельскі стараста меў службовы знак, на ім быў адлюстраваны герб Слоніма.

Сельскі стараста на той час - самая ніжэйшая прыступка ў іерархіі Расійскай імперыі, выбарная службовая асоба сельскага грамадства. Абавязкі гэтай службовай асобы былі замацаваная ў "Общем Положении о крестьянах, вышедших из крепостной зависимости от 19 февраля 1861 года".

## Знак Шуйскага палка





Да Першай сусветнай вайны ў Слоніме дыслакаваўся 118-ы пяхотны Шуйскі полк Расійскай імператарскай арміі. Ён меў свой палкавы знак.

# Палкавыя нагрудныя знакі






З кастрычніка 1922 года да восені 1939 года у Слоніме дыслакаваліся 79 пяхотны полк імя Льва Сапегі і 80 полк навагрудскіх стралкоў. Расквартэравалі вайскоўцаў у былых царскіх казармах, якія былі пабудаваныя разам з царквой у 1884-1886 гадах для царскага Шуйскага пяхотнага палка. Дарэчы, гэтыя казармы зберагліся да сённяшніх дзён, там цяпер знаходзяцца вайскоўцы Слонімскай 11-й механізаванай брыгады. Палкі мелі і свае нагрудныя знакі.

# Сабачыя жэтоны

Пры Польшчы (1920-1939 гады) кожная сям'я павінна была рэгістраваць сваіх хатніх сабак. Ім выдаваліся спецыяльныя жэтоны, якія сабакі насілі на шыі. Магчыма, такія жэтоны выдаваліся толькі для паляўнічых сабак. Вось так выглядаў слонімскі жэтон для сабак.



# Нумаркі ад брычак


















Пры Польшчы да верасня 1939 года гэтыя нумаркі прымацоўваліся на брычкі, на якіх рамізнікі развозілі пасажыраў. Яны выдаваліся ўладамі павета або горада (гміны). Найчасцей на нумарках пададзены быў год яго выдачы, назва павета, горада (гміны) і чарговы нумар. Нумаркі мяняліся кожны год і мелі розны кшталт (кругападобны, авальны, квадратны і іншыя). Яны таксама адносяцца да фалерыстыкі.

## Першы пасляваенны значок

Самым першым значком, які выйшаў пасля 1945 года, быў значок, прысвечаны 25-годдзю вызвалення Слоніма ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На ім адлюстраваны помнік загінуўшым воінам, які знаходзіцца на вуліцы Пушкіна.







## Сувенірныя медалі, 1980-я гады







У 1980-х гадах у Слоніме ЗАГС выдаваў вось такія памятныя медалі пры ўступленні ў шлюб маладажонаў і пры нараджэнні немаўляткі. Медалі выпускаліся па-беларуску. Для тых, хто ўступаў у шлюб, на ім былі адлюстраваны два пярсцёнкі і словы: "Шчасця вам у жыцці". А з другога боку медаля - прозвішчы і імёны маладога і маладой, дата, калі распісваліся ў ЗАГСе, і слова "Слонім". Падобныя медалі магчыма маюць у сваіх хатніх калекцыях многія старэйшыя слонімцы. Цяпер падобных медалёў ніхто нікому ў Слонімскім ЗАГСе не выдае.

# ААТ "Кардонна-папяровы завод "Альбярцін"










За сваю шматгадовую гісторыю Слонімскі КПЗ "Альбярцін" праходзіў шмат розных рэарганізацый і перабудоў. 1927 год лічыцца годам нараджэння завода.

Да 50-годдзя прадпрыемства выпушчаны памятны медаль і значок. На памятным медалі адлюстраваны герб прадпрыемства і тэкст: "50 лет СКБЗ. 1977". А на значку, акрамя эмблемы, напісаны тэкст: "50 лет СКБЗ". Выдаваўся і памятны значок у выглядзе медаля.

## Альбярцінскія значкі з памылкай







Былі выпушчаны два значкі, прысвечаны Альбярціну. Але яны выйшлі з памылкамі: замест слова "Альбярцін" - на значках напісана "Альберцін". Адзін з іх быў выпушчаны ў Кіеве ў серыі гярбоў на значках пад назвай "Чырвонаносікі".

# Памятны медаль




У Слонімскім раённым краязнаўчым музеі імя Стаброўскага захоўваецца памятны медаль з тэкстам на беларускай і рускай мовах: "Гродненская губерня. Гродзенская вобласць. Слоним. 1352-2002.750. 1892-2002". Медаль, відаць, быў выпушчаны да 200-годдзя Гродзенскай губерні.

# Слонімская фабрыка мастацкіх вырабаў




Фабрыка афіцыйна была зарэгістравана 24 мая 1945 года. Да свайго 50-годдзя адміністрацыя фабрыкі выпусціла значок на беларускай мове: "50 год. Слонімская фабрыка мастацкіх вырабаў".

# ААТ "Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка"




Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка пачала працаваць у 1977 годзе. Гэта адзінае на сёння прадпрыемства ў Слоніме з тых пяці тыповых, адначасова пабудаваных прадпрыемстваў СССР, якое працуе і выпускае камвольную пражу. Вядомы адзін значок-медаль, на якім пазначаны год заснавання прадпрыемства - 1977 і напісана: "Слонимская КПФ".

## Слонімская фабрыка "Тэкстыльшчык"

У 1945 годзе былі заснаваны ў Слоніме арцелі "Бальшавік" і "1 Мая". Потым на базе іх зліцця стварылі фабрыку "Тэкстыльшчык". Цяпер яе няма. Але застаўся на памяць слонімцам значок-медаль з тэкстам: "1945. Слоним. "Текстильщик".




## Слонімская фабрыка пер'е-пуховых вырабаў

З невялікіх арцеляў у 1940 годзе быў створаны Слонімскі райпрамкамбінат, які ў 1988 годзе перайменаваны ў фабрыку пер'е-пуховых вырабаў. Сёння фабрыкі няма, але застаўся прыгожы значок.




## Слонімская мэблевая фабрыка

У 1955 годзе ў Слоніме на базе арцелі "Чырвоны сталяр" была створана мэблевая фабрыка. Аўтару вядомы толькі адзін значок, прысвечаны фабрыцы.



## Слонімскі водаправод







Да 100-годдзя Слонімскага водаправода выпускаўся памятны настольны медаль, а да 120-годдзя водаправода быў выпушчаны прыгожы нагрудны знак.

## Аўтарамонтны завод

Слонімскі аўтарамонтны завод ужо не існуе. Ён быў адкрыты летам 1944 года. Да 40-годдзя завода ў 1984 годзе выпускаўся значок, на якім адлюстраваны "Масквіч" і тэкст: "Авторемзаводу 40. Слоним-84".




## Эмблема мясакамбіната

ААТ "Слонімскі мясакамбінат" узнік у 1923 годзе. 101 год таму. Аўтару гэтага выдання знаёмы толькі адзін значок з эмблемай прадпрыемства.



# Лясгас




Слонімскі лясгас ствараўся ў канцы 1939 года. А аднавіў сваю працу пасля вайны ў 1944 годзе. У 1994 годзе да 50-годдзя быў выпушчаны нагрудны знак.

# Упраўленне магістральных газаправодаў







Да 40-годдзя Слонімскага ўпраўлення магістральных газаправодаў быў выпушчаны спецыяльны значок. А ў 1999 годзе падчас уводу ў Слоніме ў эксплуатацыю першага ўчастка магістральнага газаправода "Ямал-Еўропа" таксама з'явіўся памятны значок.

# Танк на значку

Ёсць у калекцыі фалерыстаў і значок, прысвечаны слонімскаму помніку-танку. Дзіўны значок. На ім напісана слова Слонім і чамусьці - Гродзенскі раён, а не Гродзенская вобласць.



## Значок "Газета Слонімская"




Незалежная прыватная "Газета Слонімская" выдавалася ў Слоніме ў 1997-2020 гадах. Выпускаўся і значок газеты.

## Слонімскі драматычны тэатр







34 гады ў Слоніме існуе дзяржаўны драматычны тэатр. Са сваімі пастаноўкамі тэатр аб'ездзіў амаль усю рэспубліку. Да 20-годдзя тэатра выпускаўся памятны медаль, а таксама парадаваў фалерыстаў і значок, прысвечаны тэатру.

## Фестываль сямейнай творчасці

Чатыры рэспубліканскія фестывалі сямейнай творчасці "Жывіце ў радасці" адбыліся ў Слоніме. Выпускаўся і значок да другога фестывалю.



# Аб'яднанне "Ветразь"






У снежні 2006 года было ліквідавана слонімскае маладзёжнае грамадскае аб'яднанне "Ветразь". Але за час свайго існавання аб'яднанне паспела выдаць некалькі значкоў, найперш, адрасаваных роднаму Слоніму.

# Кадэцкія класы




У Слонімскай СШ № 9 існуюць кадэцкія класы. Яны маюць і свае памятныя значкі.

# Рэдкі значок




Пасля таго, як разваліўся Савецкі Саюз, многія аматары фалерыстыкі імкнуліся выпусціць свае значкі з геральдыкай. А некаторыя гарады і пасёлкі Беларусі не мелі ў той час сваёй геральдыкі. Але значкі выпускаліся, як напрыклад гэты, прысвечаны Слоніму.

# Яўген Леашэня

Яўген Леашэня (1900-1981) - генерал-лейтэнант інжынерных войск, ганаровы грамадзянін Слоніма, родам са Слоніма. У мясцовым раённым краязнаўчым музеі захоўваецца вось такі медаль.




# Слонімская міля

У гонар сямейнага забегу "Слонімская міля" ўсім слонімцам, якія прымалі ўдзел у забегу, выдавалі памятныя медалі.




# Яўрэйскі памятны медаль







Гэты настольны памятны медаль быў выпушчаны да 50-годдзя яўрэйскай партызанскай барацьбы.

# Вясковыя значкі








Была спроба выдаваць значкі, прысвечаныя слонімскім вёскам. Выйшлі значкі, прысвечаныя Кастровічам, Вераб'евічам і Новадзявяткавічам. Адзін з іх выйшаў з памылкай.

# Вайсковая "Гвардыя"

Нагрудным знакам "Гвардыя" узнагароджваліся вайскоўцы Слонімскай 11-й асобнай механізаванай брыгады.




# Нагрудны знак дывізіі

Нагрудны знак, які ўручалі ветэранам Новазыбкаўскай мотастралковай дывізіі, якая прайшла шлях у гады Другой сусветнай вайны: Кінель-Новазыбкаў-Жлобін-Слонім-Кенігсберг.



# Нагрудны знак міліцыі

Кожны РАУС Беларусі мае свой нагрудны знак. У Слонімскага РАУС вось такі.




# Значок медкаледжа

У 1939 годзе была заснавана двухгадовая школа медыцынскіх сясцёр. Пасля вайны ў 1944 годзе яна зноў пачала працаваць. З 1954 года школа была рэарганізавана ў медвучылішча. Цяпер - Слонімскі дзяржаўны медыцынскі каледж.



# Вышэйшая ўзнагарода

На адной з сесій Слонімскага раённага Савета дэпутатаў было прынята рашэнне пра ўстанаўленне знаку "За заслугі". Гэтым знакам з'яўляецца своеасаблівы медаль. Ім будуць узнагароджваць тых людзей, якія ўнеслі вялікі ўклад у развіццё Слонімскага раёна.



## Значок школьнага музея

Заснавальнік школьнага музея СШ № 4 г.Слоніма Аляксандр Жукоўскі ў свой час выдаў значок школьнага музея. На ім напісаны залатыя словы: “Шукаць, даследаваць, вывучаць”.




## Да 70-годдзя бібліятэкі

Да 70-годдзя Слонімскай раённай бібліятэкі імя Якуба Коласа быў выпушчаны керамічны медаль.




## Прысвечаны Янку Купалу

Народны паэт Беларусі Янка Купала (1882-1942) толькі адзін раз пабываў у Слоніме ў 1939 годзе. Да 140-годдзя песняра слонімцы выпусцілі такі керамічны медаль.



## Школьныя значкі







Многія школы рэспублікі маюць свае ўласныя значкі. Такія значкі выпусцi і некаторыя слонімскія школы.

## Жыровічы
















Жыровічы маюць свой герб. На ім адлюстраваны дзве мужчынскія постаці ў блакітным полі. Левая постаць стаіць на каленях, правая трымае ў працягнутых руках кнігу. Герб ужы-

ваецца з XVII стагоддзя. Жыровічам прысвячалася некалькі значкоў, часцей за ўсё з гербам. Значкі выдавалі на беларускай і рускай мовах. Быў значок і з памылкай. У слове "Жыровічы" замест літары "ы" напісана руская літара "и". Прыгожы значок, прысвечаны Жыровічам выйшаў у серыі "Геральдыка Беларусі".

## Жыровіцкі абраз Маці Божай












Жыровіцкі абраз Маці Божай - адна з хрысціянскіх святынь на Беларусі, якая ўшаноўваецца праваслаўнай і грэка-каталіцкай цэрквамі як цудатворная. Знаходзіцца абраз у Жыровіцкім Свята-Успенскім мужчынскім манастыры. У розны час і Жыровіцкаму абразу Маці Божай, і Успенскаму сабору прысвячаліся памятныя медалі.

# Жыровіцкі каледж




У 1945 годзе ў Жыровічах быў адкрыты тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі. З 1999 года ён пачаў называцца Дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж.

# Мінская духоўная семінарыя ў Жыровічах




У 1989 годзе на тэрыторыі Жыровіцкага манастыра была адноўлена Мінская духоўная семінарыя. У 1991 годзе яна пераўтворана з сярэдняй у вышэйшую навучальную ўстановы з 5-гадовым тэрмінам навучання. Да 25-годдзя семінарыі быў выдадзены спецыяльны значок.

# Серафім Жыровіцкі

Рэлігійны дзеяч, свяшчэннамучанік, новапакутнік Мінскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы Серафім Жыровіцкі (Раман Шахмуць, 1901-1946) быў закатаваны ў сталінскіх лагерах. Існуюць два медалі Серафіма Жыровіцкага першай і другой ступені.





# Да 500-годдзя Успенскага Жыровіцкага манастыра



У 2020 годзе быў выпушчаны спецыяльны медаль "У памяць 500-годдзя Успенскага Жыровіцкага мужчынскага манастыра. 1520-2020".

# Манастырскі забег







У 2022 годзе ў Жыровічах адбыўся першы рэспубліканскі "Манастырскі забег". У 2023 годзе - прайшоў другі "Манастырскі забег". У іх прымалі ўдзел некалькі тысяч чалавек. Старт і фініш адбываўся каля Успенскага сабора. На фінішы ўсім удзельнікам забегаў уручаліся спецыяльныя памятныя медалі.

# Памятныя футбольныя медалі





















































Штогод у Слоніме адбываюцца розныя спаборніцтвы па футболу сярод школьнікаў і дарослых. Вельмі часта праходзяць турніры па міні-футболу. Іх вельмі шмат. Пераможцы заўсёды ўзнагароджваюцца медалямі.

# Турнір, прысвечаны наданню Слоніму Магдэбургскага права

У 2015 годзе ў Слоніме адбыліся футбольныя спаборніцтвы, прысвечаныя наданню Слоніму Магдэбургскага права. Пераможцы атрымалі памятныя медалі.



# Значкі, прысвечаныя слонімскім футбольным клубам















У розны час выпускаліся значкі, прысвечаныя слонімскім футбольным клубам "Камунальнік", "Белтрансгаз", "Слонім".

# На прызы Івана Ціхана








Штогод летам у Жыровічах праходзяць спаборніцтвы на прызы заслужанага майстра спорту Івана Ціхана, які родам з вёскі Глоўсевічы Слонімскага раёна. Лепшым юным спартсменам заўсёды ўручаюцца памятныя медалі.

# Памяці Уладзіміра Раманоўскага





Штогод у Слоніме праходзяць адкрытыя рэспубліканскія спаборніцтвы па грэблі на байдарсках і каноэ памяці алімпійскага чэмпіёна са Слоніма Уладзіміра Раманоўскага (1957-2013). Пераможцы атрымліваюць спецыяльныя медалі.

# Медалі спартакіядаў і турніраў па лёгкай атлетыцы



















Адбываюцца ў Слоніме штогод цікавыя раённыя спартакіяды і турніры па лёгкай атлетыцы. Пераможцы заўсёды атрымліваюць памятныя медалі.

# Змест


Фалерыстыка .................................................................. 3
З гісторыі Слоніма.......................................................... 4
Значкі з гербам Слоніма ................................................ 9
Нагрудны знак, пачатак XX стагоддзя ............................ 12
Слонімскі службовы знак "Сельскі стараста", 1861 год ...... 12
Знак Шуйскага палка ..................................................... 13
Палкавыя нагрудныя знакі ............................................. 14
Сабачыя жэтоны ............................................................. 14
Нумаркі ад брычак ......................................................... 15
Першы пасляваенны значок ............................................ 16
Сувенірныя медалі, 1980-я гады ...................................... 16
ААТ "Кардонна-папяровы завод "Альбярцін" ..................... 17
Альбярцінскія значкі з памылкай ..................................... 17
Памятны медаль ............................................................. 18
Слонімская фабрыка мастацкіх вырабаў ........................... 18
ААТ "Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка" ........... 18
Слонімская фабрыка "Тэкстыльшчык" ................................ 19
Слонімская фабрыка пер'е-пуховых вырабаў ...................... 19
Слонімская мэблевая фабрыка .......................................... 19
Слонімскі водаправод ....................................................... 20
Аўтарамонтны завод ........................................................ 20
Эмблема мясакамбіната ................................................... 20
Лясгас ............................................................................ 21
Упраўленне магістральных газаправодаў .......................... 21
Танк на значку ............................................................... 21
Значок "Газета Слонімская" .............................................. 22
Слонімскі драматычны тэатр ............................................. 22
Фестываль сямейнай творчасці ......................................... 22
Аб'яднанне "Ветразь" ...................................................... 23
Кадэцкія класы ............................................................... 23
Рэдкі значок .................................................................. 23
Яўген Леашэня ............................................................... 24
Слонімская міля .............................................................. 24
Яўрэйскі памятны медаль ................................................ 24

Вясковыя значкі ........................................................................ 25
Вайсковая "Гвардыя" ................................................................ 25
Нагрудны знак дывізіі ............................................................... 25
Нагрудны знак міліцыі .............................................................. 26
Значок медкаледжа ................................................................... 26
Вышэйшая ўзнагарода ............................................................... 26
Значок школьнага музея ............................................................ 27
Да 70-годдзя бібліятэкі .............................................................. 27
Прысвечаны Янку Купалу ......................................................... 27
Школьныя значкі ....................................................................... 28
Жыровічы ................................................................................. 28
Жыровіцкі абраз Маці Божай .................................................... 29
Жыровіцкі каледж ..................................................................... 30
Мінская духоўная семінарыя ў Жыровічах ................................ 30
Серафім Жыровіцкі ................................................................... 30
Да 500-годдзя Успенскажа Жыровіцкага манастыра ........... 31
Манастырскі забег ..................................................................... 31
Памятныя футбольныя медалі .................................................. 32
Турнір, прысвечаны наданню Слоніму Магдэбургскага права 34
Значкі, прысвечаныя слонімскім футбольным клубам ........ 34
На прызы Івана Ціхана .............................................................. 35
Памяці Уладзіміра Раманоўскага .............................................. 35
Медалі спартакіядаў і турніраў па лёгкай атлетыцы ........... 36

Сяргей Мікалаевіч Чыгрын. Слонімшчына ў люстэрку фалерыстыкі. На беларускай мове. Ліда, “Пружмень”, 2024, 40 ст. Фармат - А-5. Наклад - 30 асобнікаў. Папера дыхтоўная. Друк кампутарны, поўнаколерны.


ГЕРАЛЬДЫКА БЕЛАРУСІ
ЖЫРОВІЧЫ


ГЕРАЛЬДЫКА БЕЛАРУСІ
КАСТРОВІЧЫ


ГЕРАЛЬДЫКА БЕЛАРУСІ
НОВАДЗЯВЯТКОВІЧЫ